ISSN 1024-5928 (print)

## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*
LITERARY SCIENCE

УДК 821.161.3.09(092)+929Купала

Паступіў у рэдакцыю 11.04 2017
Received 11.04.2017

**У. В. Гніламедаў, М. У. Мікуліч**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ПРАРОК АДРАДЖЭННЯ
## *(Да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы)*

Анализируются жизнь и творчество классика белорусской литературы Янки Купалы (1882–1942), оставившего глубокий след в истории белорусской культуры ХХ века. Рассматриваются сборники лирики «Жалейка», «Гусляр», «Путем жизни», «Наследие» и др., а также поэмы, драматургия, публицистика. Авторы стремятся преодолеть устоявшиеся идеологические штампы и недоговоренность, которые до нынешнего времени препятствуют восприятию и пониманию творчества великого художника.

*Ключевые слова:* художественная литература, поэзия, творческая индивидуальность, национальное сознание, менталитет, романтический, стилевое течение, влияние.

**V. V. Gnilomedov and N. V. Mikulich**

*Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

# PROPHET OF RENAISSANCE
## *(To the 135th Anniversary of Yanka Kupala's Birth)*

The article explores the life and work of the classic of Belarusian literature Yanka Kupala (1882–1942) who made a great impact on the history of Belarusian culture of the twentieth century. It addresses collections of his lyrics, such as "Zhaleika" (Hornpipe), "Guslyar" (Gusli Player), "On the Way of Life", "Heritage" etc. and his poems, plays and journalism. The authors seek to overcome the established ideological clichés and inconsistency which until now hamper the perception and understanding of this great writer's work.

*Keywords:* fiction, poetry, creative individuality, national consciousness, mentality, romantic, literary style trend, influence.

Янка Купала – народны паэт Беларусі, паэт-прарок, паэт-будзіцель, які на працягу ўсяго свайго жыцця быў апантаны лёсам роднага краю, беларускага народа, яго доляй і будучыняй. Гэта – фенаменальная з'ява беларускай літаратуры і культуры, беларускай гісторыі наогул. В. Быкаў слушна падкрэсліваў: «Янка Купала, безумоўна, апостал беларушчыны, адзін з самых сьвятых людзей Беларусі, найпершы паэт чарговага беларускага Адраджэньня» [8, с. 202].

Сапраўднае яго прозвішча – Луцэвіч Іван Дамінікавіч. Нарадзіўся ён амаль на купалаўскае свята – 7 ліпеня 1882 г. (па новым стылі) у самым цэнтры Беларусі, пад Мінскам, у фальварку Вязынка былой Радашковіцкай воласці (зараз Маладзечанскі раён Мінскай вобласці). На Міншчыне нарадзіліся і бацькі паэта: бацька Дамінік Ануфрыевіч – у засценку Пяскі, каля Ігумена (Ігумен – цяперашні Чэрвень), маці Бянігна Іванаўна паходзіла з фальварка Няшота, што непадалёк ад мястэчка Рубяжэвічы. Абое належалі да дробнай шляхты, пабраліся шлюбам у 1879 г. (Бянігна Іванаўна нават супраць волі бацькоў, парваўшы з сям'ёй). Сваёй зямлі ў Луцэвічаў не было, і Дамінік Ануфрыевіч вымушаны быў (дарэчы, як і яго бацька) стаць арандатарам памешчыцкіх фальваркаў.

У беларускага народа нарадзіўся паэт, які, здаецца, і не мог узяць іншы псеўданім, апроч адзінага – Янка Купала. Жыве ў славян яшчэ і сёння легенда пра тое, што ў самую кароткую летнюю ноч, у ноч на Івана Купалу, зацвітае на імгненне кветка папараці. Хто знойдзе яе – той знойдзе шчасце. Казачна-фальклорнае ўлонне легенд, песень, паданняў, цікавых і незвычайных аповедаў атуляла будучага паэта з самага маленства, калі пачалася яго нялёгкая жыццёвая пуцявіна.

Дзяцінства Янкі Купалы прайшло ў вандраваннях па Міншчыне – ад фальварка да фальварка, ад пана да пана. У Косіне, калі Ясю споўнілася шэсць гадоў, ён упершыню пачаў вучыцца грамаце – сын аднаго са служачых маёнтка па прозвішчы Патаповіч (імя невядома) навучаў яго

© Гніламедаў У. В., Мікуліч М. У., 2017

па-польску. Хлопчык рос добразычлівым, шчырым, дапытлівым, разумным і, як успаміналі сёстры, вельмі спагадлівым да людзей. У Сенніцы бацька аддае сына ў мясцовае двухкласнае народнае вучылішча, дзе ён займаецца ў настаўніцы Алімпіяды Сонцавай.

Вучыўся ён і ў вандроўных настаўнікаў, і сам пры магчымасці, у вольны ад работы час, многа чытаў, займаўся самаадукацыяй. Сярод тых, хто паўплываў на будучага паэта, быў Уладзімір Самойла – пазней вядомы літаратар, які шмат дапаможа Купалу на яго творчым шляху, а таксама Зыгмунт Чаховіч – удзельнік паўстання 1863 г. У яго маёнтку (у Селішчы) знаходзілася багатая бібліятэка.

У 1902 г. здарылася няшчасце, памёр бацька Дамінік Ануфрыевіч – у чужой хаце, так і не прыдбаўшы ўласнага кавалка зямлі. Ясь – старэйшы з семярых дзяцей – застаецца за гаспадара. Праз паўгода памірае ад шкарлятыны малодшы брат Казік, а яшчэ праз тыдзень паміраюць сёстры Сабіна і Галя. Трэба сказаць, Купала перажыў за сваё жыццё шмат глыбокіх і моцных узрушэнняў, якія адбіліся на яго творчасці. Аднак смерць бацькі, брата і сясцёр скаланула яго да глыбіні душы. Адчуванне абдзеленасці шчасцем-доляю не пакідала паэта на працягу ўсяго яго жыцця...

Першыя творы Я. Купалы напісаны, як вядома, па-польску, але неўзабаве, як азарэнне, прыйшло разуменне: для больш поўнага і свабоднага самавыяўлення і самарэалізацыі, каб цябе пачулі людзі, пачуў і зразумеў народ, трэба размаўляць з ім на роднай мове. Купала, такім чынам, – з’ява не выпадковая, а лёсавызначальная («судьбаносная», гаворачы па-руску). Імкненне паэта «пісаць па-беларуску» супала з уздымам хвалі рэвалюцыйных настрояў, набліжэннем рэвалюцыі 1905–1907 гг., што ў многім было выклікана паражэннем Расіі ў руска-японскай вайне, якая паказала яе адсталасць і няздатнасць самадзяржаўя кіраваць імперыяй. Ажыўляецца нацыянальна-вызваленчы, патрыятычны рух і на Беларусі, узнікае палітычная партыя – Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), якая, дарэчы будзе сказаць, звярнулася да беларускага чалавека ў сваіх праграмных адозвах на яго роднай мове. Сярод яе арганізатараў былі вельмі вядомыя потым дзеячы: браты Луцкевічы, А. Бурбіс, К. Кастравіцкі (Карусь Каганец), В. Іваноўскі, В. Ластоўскі, А. Пашкевіч (Цётка), Ф. Стацкевіч, А. Уласаў, Ф. Умястоўскі (Дзядзька Пранук), А. Смоліч і інш. На платформе гэтага актыўнага, свядомага і дзейснага нацыянальна-дэмакратычнага руху і засноўваўся паэт у сваіх ідэйных і мастацкіх пошуках.

15 мая 1905 г. у мінскай газеце «Северо-Западный край» малады паэт публікуе свой славуты верш «Мужык», падпісаны псеўданімам «Я. Купала». Гэта і было яго першае выступленне ў друку. Газета выходзіла на рускай мове, але купалаўскі верш быў апублікаваны ў арыгінале – ды ён таго і заслугоўваў.

Але хоць колькі жыць тут буду,
Як будзе век тут мой вялік,
Ніколі, браткі, не забуду,
Што чалавек я, хоць мужык [3, с. 52], –

гучна прамаўляе герой верша. Сучаснікі ўбачылі ў гэтым творы вострую і па-мастацку пераканаўчую крытыку таго спаконвечнага песімізму, якім былі ахутаны лёс і само існаванне беларускага народа. З гонарам сапраўднага дэмакрата Купала сцвярджае павагу да простага чалавека, права змагацца за сваё чалавечае званне.

У характары верша і ўсім кампазіцыйна-стылявым ладзе адчувалася спакойная ўпэўненасць, эпічная ўгрунтаванасць, тыя духоўная нерастрачанасць і моц, што ідуць ад беларускай літаратуры XIX ст. і нават ад больш даўніх эпох і сведчаць пра яго прыналежнасць да глыбокай нацыянальнай традыцыі. Якой бы цяжкай ні была доля беларуса, яна дазволіла яму выпрацаваць свой менталітэт і захаваць нацыянальную адметнасць, што ён і падкрэсліваў, называючы сябе тутэйшым. У многіх творах паэта глыбока выяўляюцца вызначальныя асаблівасці нацыянальнага тыпу мыслення, нацыянальнага характару, як, напрыклад, у вершы «Ці ж гэта многа?!»:

Ад свету, ад Бога
Жадаю нямнога:

Зямелькі з валоку,
К ёй шнур неўдалёку,
З святлічкай хацінку,
За жонку дзяўчынку,

Кусок салца к хлебу,
Рубля на патрэбу,
Здароўя чым болей,
Крыху долі, волі –
І ўсё! больш нічога...
Ну, ці ж гэта многа?! [3, с. 142].

Гістарычнае быццё народа, яго шлях з мінулага ў будучыню сталі крыніцай творчага натхнення Купалы, жывілі яго думку і пачуцці на працягу ўсяго жыцця. У 1907 г. ён стварае сваё знакамітае «Ворагам Беларушчыны» – водпаведзь рускім і польскім шавіністам, якія беспадстаўна нападалі, паводле выразу паэта, «на ўсё беларускае»:

Чаго вам хочацца, панове?
Які вас выклікаў прымус
Забіць трывогу аб той мове,
Якой азваўся беларус?
……………………………..

К свабодзе, роўнасці і знанню
Мы працярэбім сабе след!
І будзе ўнукаў панаванне
Там, дзе сягоння плача дзед! [3, с. 133, 134].

Гэта адзін з самых выдатных узораў ранняй купалаўскай лірыкі. У вершы знайшоў адэкватнае самавыяўленне той неўтаймоўна-бурлівы стан, у якім знаходзіўся ў той час паэт, прамоўніцкім пафасам і тэмпераментам нагадваючы біблейскага прарока Іезікііля. Кніжная мова ў духу старога тэстаменту зітавана тут з народна-бытавым словам, размоўнай інтанацыяй. Верш «Ворагам Беларушчыны» ўзнавіў і развіў традыцыі палемічнай беларускай літаратуры XVI–XVII стст. – А. Філіповіча, М. Сматрыцкага, С. Зізанія і іншых пісьменнікаў, якія стаялі на варце нацыянальных інтарэсаў свайго народа і не давалі яго ў крыўду розным непрыяцелям і нядобразычліўцам.

Гісторыя літаратуры сведчыць, што вершы сапраўднага паэта нашмат выйграюць, калі іх збіраюць разам. Гэтую ісціну пацвердзіла і «Жалейка» – першы купалаўскі зборнік, які з’явіўся на свет у 1908 г. у выдавецтве «Загляне сонца і ў наша ваконца». Кнігу прыхільна сустрэлі грамадскасць і літаратурная крытыка, на якіх яна зрабіла вялікае ўражанне.

«Жалейка» населена беларускімі тыпамі. Гэта мужык-земляроб (у розных іпастасях), пан (ці «панічок», як называе яго паэт) – уладальнік маёнтка, шматлікія падпанкі, жнеі, рамеснікі, «бабулька – прадаўшчыца зёлак», «Сорка, што соль прадае»... Вось яны – жнеі (верш «Песня жней»):

Пагнуўшы ў крук худыя спіны,
Сярпом махаючы крывым,
Мы, жонкі, ўдовы і дзяўчыны,
Пры доўгай постаці стаім.

І дружна жнём,
І паддаём
Адна адной
Ахвоты больш,
І песню жаласна пяём... [3, с. 90].

Рытмічнае поўнагалоссе верша даносіць да чытача не проста рух, дынаміку жніва, але і, можна сказаць, працоўную заўзятасць жней, апантанасць працай, энтузіязм – усё гэта рысы іх менталітэту.

«Жалейка» пацвердзіла, што прырода мастацкага метаду яе аўтара – рамантычная, многія вершы сведчылі пра ўменне паэта заглянуць за гарызонт будзённага жыцця, пранікнуць у сутнасць грамадска-сацыяльных падзей. Купала рана ўбачыў у народзе сілу таго, што крыху пазней вядомы псіхааналітык К. Юнг назаве «калектыўным бессвядомым», якое кіруе падзеямі і фарміруе чалавечы лёс. Адным з такіх твораў было яго славутае «А хто там ідзе?»:

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
– Беларусы.

А што яны нясуць на худых плячах,
На руках у крыві, на нагах у лапцях?
– Сваю крыўду [3, с. 196].

Народ Купала бачыць як адно цэлае, здольнае, па часе, на адраджэнне і абнаўленне сваёй духоўнай самасвядомасці. «А хто там ідзе?» – самы вядомы ў свеце беларускі верш, перакладзены на многія і многія замежныя мовы. Ён створаны ў духу старога біблейскага тэстаменту (карціна зыходу яўрэяў з Егіпта) і дае важныя падставы, таксама як і «Ворагам Беларушчыны» і некаторыя іншыя творы, гаварыць пра сувязь Купалы з Бібліяй. Як паэт-прарок, вяшчун Адраджэння, ён свядома і інтуітыўна адчуваў патрэбу засноўвацца не толькі на навукова-асветніцкіх ідэях, але і на ўсім вопыце чалавецтва, у тым ліку і рэлігійным. Біблія давала яму магчымасць глабальнага погляду на гісторыю свайго народа.

Памылкай было б нават на ранніх этапах творчасці лічыць Купалу толькі вясковым, сялянскім паэтам – яго творчасць уключала агульначалавечую праблематыку. Пра гэта сведчыць, да прыкладу, драматычная паэма «Адвечная песня» (1908). Рэальнае жыццё яе героя Мужыка не проста неўладкаванае і трагічнае – яно абсурднае. Бо якім жа яшчэ можа быць існаванне чалавека, цалкам пазбаўленага правоў і асабістай годнасці, як не абсурдным па самой сваёй сутнасці? У жыцці і смерці Мужыка Купалу бачыцца ўніверсальная мадэль чалавечага лёсу. На фарміраванне задумы «Адвечнай песні» зрабіла ўплыў, як гэта лічаць многія купалазнаўцы, п’еса Л. Андрэева «Жыццё чалавека». Такую ж ролю, думаецца, магла адыграць і другая п’еса Л. Андрэева – «Цар-Голад», пабудаваная на падобных драматургічных прынцыпах. Па сутнасці, Купала, як і рускі пісьменнік, за паўстагоддзя да экзістэнцыялістаў паставіў пытанне аб абсурдным характары чалавечага існавання, у многім апярэдзіўшы іх мастацкія адкрыцці. Але гэта была і спрэчка з Л. Андрэевым. Тут маем справу з паэтычнымі элементамі мадэрнізму, пераасэнсаванымі аднак у духу рэалізму, у выніку чаго яны атрымалі новую мастацкую функцыю. Яны не закрэсліваюць усіх спадзяванняў на лепшае. У паэме, як бы там ні было, адчуваецца прысутнасць думкі, заключанай у старажытным народным выслоўі: паміраеш, а жыта сей!

У 1910 г. убачыў свет другі зборнік вершаў паэта – «Гусляр». Лірычны герой гэтай кнігі – чалавек, магутны духам і воляю. Ён хоча скарыстаць свае права на самарэалізацыю, на апраўданне свайго чалавечага прызначэння. Тут Купала працуе на ўсю шырыню і моц свайго мастацкага таленту – зборнік «Гусляр» раскрывае духоўны свет асобы ў яе імкненні да разняволення і свабоды, і не ў абы-якіх маштабах, а ў маштабах усяго чалавецтва. Для гэтага патрэбны былі моцныя паэтычныя крылы, і Купала іх меў.

Праграмныя вершы паэта «Сон», «Гусляр» і некаторыя іншыя былі, думаецца, напісаны не без уплыву У. Самойлы, эстэтычныя погляды якога фарміраваліся пад уздзеяннем рускага сімвалізму. Рэцэнзуючы зборнік «Жалейка», ён знаходзіў у аўтара празмерны «палітычны ўхіл» [9]. Цяпер, у новай кнізе, паэт выступае як «гусляр», «сын міру», «абраннік». Абсягі яго творчасці пашыраюцца, ён імкнецца асэнсаваць чалавека ў багацці яго разнастайных жыццёвых сувязей і дачыненняў.

У «Гусляры» Купала бліжэй падступае да нацыянальнай ідэі. Ён выдатна разумеў, што пры адсутнасці ў беларусаў сваёй дзяржаўнасці і нацыянальнай незалежнасці, развітых форм уласнага палітычнага і эканамічнага жыцця культура, літаратура, паэзія, нарэшце, выступаюць у якасці важнейшага аб’яднальнага фактару, які садзейнічае захаванню народа і яго патрыятычнай кансалідацыі. Сучаснасць, на думку паэта, мела патрэбу ў паэтызацыі і ўзвышэнні мінулага, а таксама ў яго пераасэнсаванні з новага пункта гледжання, які добра відаць у вершы «Над Нёманам» (1911):

Край, дзе жыццё я сваё пачынаю,
Шмат весялей прыглядаўся на свет,
Песні і казкі інакшыя баяў,
Шчасце цвіло ў ім, як макавы цвет... [5, с. 11].

Тэма «мінуўшых дзён» хвалявала Купалу неадступна, ён шукаў адказаў на шматлікія набалелыя пытанні: што ж усё такі здарылася з цэлым народам? Паэт усё далей ішоў па шляху ўсведамлення гістарычнага быцця народа, каранёў яго дзяржаўнасці, што хаваліся ў сівой даўніне,

у існаванні такіх аб’яднанняў, як Полацкае княства, а затым Смаленскае, Тураўскае і інш. З глыбіні стагоддзяў усё яшчэ ішлі промні былой славы Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, у абсягах якога старажытна-беларуская дзяржаўнасць дасягнула свайго вышэйшага росквіту.

У 1910 г. узнік верш «Роднае слова» («Пад навалай крыўдаў многія сталецці...»). Гэта таксама спроба пазнаць карэнні нацыянальных «крыўд і бед». Купала бачыць, што да такога незайздроснага становішча беларускага чалавека апусцілі гістарычныя абставіны і ўмовы жыцця. Вядома, здарылася гэта не раптам, не імгненна, не адразу, а ў нейкім сэнсе паступова, ад падзеі да падзеі. Беларускі народ шмат гадоў у сваёй гісторыі перажываў катастрафічныя перыяды стрэсаў і перанапружанасці ў нацыянальных маштабах, што, безумоўна, разбурала яго дзяржаўны патэнцыял і падточвала пасіянарныя сілы. Прыкрае замаруджанне і застой гістарычнага працэсу на Беларусі назіраюцца ўжо ў сярэдзіне XVI ст. Працэс страты дзяржаўнай незалежнасці, скасавання правоў і пазбаўлення волі пачаўся ад Люблінскай уніі Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай (1569) і яшчэ ў большай ступені пасля Брэсцкай уніі (1596). Беларуская шляхта ў пераважнай большасці (за рэдкім выключэннем) кіравалася, на вялікі жаль, не столькі патрыятычнымі, колькі асабістымі разліковымі інтарэсамі. Купала добра ведаў родную гісторыю, ведаў, што за памылкі тых, хто здрадзіў радзіме і яе духоўным каштоўнасцям, за іх імкненне да багацця і ўлады расплочваўся народ.

Вясной 1913 г. выйшаў з друку трэці зборнік – «Шляхам жыцця». У ім адлюстраваўся шматпланавы падыход аўтара да жыцця, выявілася жаданне зразумець усебаковасць яго зместу. Гэта, несумненна, адна з вяршынь беларускай паэзіі пачатку XX ст. Паэт пацвердзіў, што адраджэнская мара яго і нацыянальны ідэал застаюцца ранейшымі – вярнуць свой народ на шлях актыўнага жыцця. Аўтар увесь час імкнецца павысіць пасіянарны ўзровень беларускага народа. Яго паэзія не збочвае з дарогі, на якой вырашаецца народны лёс. У зборніку «Шляхам жыцця» назіраецца ўзрастанне суб’ектыўна-лірычнага пачатку, што выявілася як у пашырэнні і паглыбленні ідэйнага зместу многіх вершаў, так і ў пэўных зрухах у сферы формы, якая спалучае ў адным стылі элементы лірыкі, гумару, іроніі, гратэску... Купалаўскі рамантызм выявіў актыўныя, нецярплівыя адносіны да жыцця, адмаўленне тагачаснага ў імя будучыні. Ён патрабаваў ёмістасці душы, здольнай ахапіць усе з’явы і працэсы рэчаіснасці, усё чалавечае існаванне ў цэлым. Паэт шукаў шляхоў да абнаўлення чалавецтва, сцвярджаў ідэю вечнага адраджэння як уласцівасць усяго прыроднага свету.

Творчая спадчына Я. Купалы – шматгранная: вершы, паэмы, п’есы, публіцыстыка. У паэмах «Зімою», «Нікому» (1906), «Сон на кургане», «Курган» (1910), «На куццю» (1911), «Бандароўна», «Магіла льва», «Яна і я» (1913) і інш., як і ў лірыцы, адлюстраваўся актыўны роздум паэта над жыццём і чалавечым лёсам.

У гэтым сэнсе асабліва звяртае на сябе ўвагу вобраз Сама з паэмы «Сон на кургане» – шматзначны, акружаны арэолам духоўнага каларыту і трагізму. Перад намі не толькі рэвалюцыянер – сацыяльны барацьбіт, а рэвалюцыянер-адраджэнец. На прыкладзе Сама паэт раскрывае асабістую драму свайго сучасніка-аднадумцы – рэвалюцыянера-адраджэнца. Адасоблены ад мас, пазбаўлены падтрымкі аднадумцаў і паплечнікаў, ён – фігура трагічная і, можна сказаць, асуджаная на паражэнне, нягледзячы нават на асабістыя высокія маральныя якасці. Сам – адначасова звычайны чалавек і як бы кімсьці зачараваны волат, што ніяк не можа наладзіць сувязь з новым часам. Гэта гордая, нязломная, крэатыўная натура, але разам з тым ён і пакутнік.

Адметнае месца ў Купалавай спадчыне займае паэма «Яна і я». У цэнтры твора дзве абагульненыя чалавечыя асобы – Яна і Я, селянін і яго жонка, жыццё і побыт якіх праходзяць у цесным адзінстве з усімі фазамі земляробчага календара. Гэты твор называюць паэмай-ідыліяй. Мы б назвалі яго своеасаблівым пастаральным раманам, вытрыманым у духу букалічнай традыцыі, якая ў сусветнай літаратуры бярэ свой пачатак яшчэ ад антычнасці. Я і Яна – гэта беларускія Тэлемон і Баўкіда XX ст. У паэме «Яна і я» паэт уславіў дабрыню, харprofile і маральны абавязак чалавека. Паэма раскрывае маральна-паэтычны свет зямнога існавання асобы, радасць гаспадара і працаўніка. Аўтар паэтызуе жыццё і працу чалавека на зямлі, захапляецца вабнасцю зямнога кахання, услаўляе непасрэднасць адчування прыроды, хараство прыроднага ўлоння.

Нацыянальна-адраджэнская тэма была ўзважана паэтам і на шалях гісторыі. У незвычайным свячэнні гістарычных асацыяцый яна паўстала ў паэме «На куццю», упершыню надрукаванай у «Нашай ніве» ў канцы 1911 г. Пачуццё гісторыі ў ёй узмоцнена рамантызмам з уласцівым для яго

абагульненым поглядам на гістарычную мінуўшчыну. У намаляваных Купалам вобразах мінулага рэальнае і ідэальнае спалучаны ў адным рамантычным вобразе, скіраваным не столькі на пазнанне і адлюстраванне гістарычнай рэчаіснасці, уласцівага ёй багацця і разнастайнасці жыццёвых праяў, колькі на выхаванне патрыятычных паводзін сучасніка. Паэтыка тут грунтуецца на ўмоўна-міфалагічнай аснове. Аўтар адкрывае заслону часу, ажыўляе мінуўшчыну, героі глядзяць на нас з глыбіні гісторыі. Дзея адбываецца на калядны вечар на старажытным замчышчы, дзе наладжана святочная вячэра – «куцця». Куцця, кут, пакуцце – этымалагічна блізкія словы. Покуцце – самае ганаровае месца за сталом, дзе звычайна садзілі дзядоў. У купалаўскай паэме на покуцці – князь з княгіняй, вакол – княжацкая дружына. Аўтар не даследуе псіхалогію сваіх герояў, а малюе перад чытачом незвычайнае відовішча, засмужаную туманам часу карціну таго, як князь кліча ганцоў і загадвае ім агледзець «усе пагранічныя капцы». Ганцы, каб выканаць загад князя, адольваюць, так сказаць, не толькі адлегласць у прасторы, але і ў часе: князь пасылае іх са свайго часу ў наш. І што на паверку атрымліваецца? Аказваецца, народ яшчэ жывы. Выканаўшы заданне, ганцы вяртаюцца, каб расказаць князю аб выніках. Абагульняючы адказ князя «Ганцом на іхнія навіны» больш чым аптымістычны:

Не ўмруць, не ўмруць ужо яны,
Раз хочуць сонца, славы, песні,
Заб'юць ім зычныя званы
Прабудным звонам на прадвесні... [4, с. 70].

Прадметна-рэалістычнае напаўненне паэмы зведзена да мінімуму. Абмеркаванне нацыянальнай праблемы адбываецца на такіх вышынях духу, на якія ўваход усяму матэрыяльнаму забаронены. Умоўныя сродкі выразнасці атрымліваюць тут паэтычнае, філасофскае і драматычнае абгрунтаванне.

Значны ўклад Я. Купалы – у драматургію, у развіццё тэатральнай справы. Першы свой сцэнічны твор – камедыю «Паўлінка» – ён напісаў у 1913 г. Яна была пастаўлена на сцэне спачатку ў Вільні, затым у Пецярбурзе і на радзіме – у Радашковічах, што з'явілася значнай падзеяй у гісторыі нацыянальнага тэатра. Тэма камедыі – канфлікт пакаленняў. Характэрныя рысы новага пакалення, што ўваходзіла ў жыццё, – узрастанне ўзроўню нацыянальнай свядомасці, любоў да свабоды, развіты асобасны пачатак, увасоблены перш за ўсё ў вобразе Паўлінкі. Гэты новы тып сцверджаны Купалам у асяроддзі моладзі. Падобны да Паўлінкі і Якім Сарока. Гэта маладая Беларусь у сваім імкненні да чалавечай годнасці, да паўнапраўнага існавання.

Жанравы рэпертуар драматургіі Я. Купалы паступова пашыраецца. Адчуваючы патрэбу публікі і маладога беларускага тэатра ў лёгкай камедыі, ён піша жарт-вадэвіль «Прымакі» (ліпень 1913 г.). Праўда, гэтаму сцэнічнаму «жарту» хапала і сур'ёзнага зместу: аўтар не ўхваляў сацыяльныя і маральныя заганы, на якія хварэлі героі камедыі, – п'янства, абмежаванасць і абыякавасць да жыцця. У верасні 1913 г. Купала завяршыў яшчэ адзін сцэнічны твор – драму «Раскіданае гняздо». Сярод тых зерняў, з якіх узнікла задума «Раскіданага гнязда», была і даўняя родавая крыўда Луцэвічаў на паноў Радзівілаў, якія некалі сагналі сям'ю арандатараў-чыншавікоў з апрацаванай імі зямлі. Дзед Ануфрый Дамінікавіч доўга судзіўся з панамі за роднае гняздо, што адняло ў яго шмат сіл і здароўя і скараціла век. Унук жа, Янка Купала, на пачатку ХХ ст. вынес сямейную крыўду «на свет цэлы», асэнсаваўшы яе як трагедыю эпахальную, агульнанародную, за якой стаяла ўсё тое ж пытанне: быць ці не быць беларускай нацыі? Драма «Раскіданае гняздо» адлюстроўвала цярністы шлях беларускага сялянства ў пошуках страчанай бацькаўшчыны і лепшай долі.

У 1917 г. паэт адчуў новыя перспектывы, якія адкрыліся перад Беларуссю і беларусамі. Кастрычніцкая рэвалюцыя была, як вядома, не выпадковай з'явай, не «бунтам адзінак», а паўстаннем мас, выбухам стагоддзямі накопленай незадаволенасці існуючымі ў Расіі парадкамі. Яна паўплывала на лёс многіх народаў, у прыватнасці, дала значны штуршок для далейшага станаўлення і развіцця беларускай нацыянальнай ідэі і яе дзяржаўнага ўвасаблення. Творчая работа Купалы ў гэты перыяд патрабавала асабліва высокага духоўнага напружання і паэтычнага напалу. Купалаўскі герой ізноў ахоплены прагай падзей і хваляванняў. Гэта адчуваецца, напрыклад, у вершы «Час!», напісаным у Смаленску 30 кастрычніка 1918 г.:

Час склікаці ўжо грамаду
На вялікую нараду,
На вялікі сход!

Хай рассудзіць, хай разважа,
Слова цвёрдае хай скажа,
Скажа сам народ! [5, с. 33].

Паэзія Купалы палітызуецца, у ёй моцна гучыць тэма беларускай дзяржаўнасці. Настаў момант, калі беларускі народ, на думку Купалы, абавязаны вылучыць са сваіх шэрагаў лідара, здольнага сабраць «у адну ўсю Беларусь сям'ю». На чале дзяржавы павінен стаяць гаспадар, што адпавядала б нацыянальным традыцыям і ўяўленням народа. Гэты заклік на ўсю сілу гучыць у вершы «Паўстань…»:

Паўстань з народу нашага, прарок,
Праяваў бураломных варажбіт,
І мудрым словам скінь з народу ўрок,
Якім быў век праз ворагам спавіт! [5, с. 65].

Біблейскі вобраз Прарока надае паэтычнай гаворцы асаблівую значнасць і ўзнімае яе на агульнанацыянальны ўзровень.

Дзяржаўнае мысленне Купалы асабліва шырока і глыбока адлюстравалася ў яго публіцыстычнай творчасці. Пачынаючы з восені 1919 г., ён друкуе ў беларускіх перыёдыках, што выдаваліся ў Мінску, шматлікія артыкулы, адозвы, фельетоны, у якіх выступае па найбольш актуальных пытаннях адраджэння нацыянальнай дзяржаўнасці і адбудовы Беларусі, абараняючы яе права на самавызначэнне і будаўніцтва свайго нацыянальнага лёсу. Пра надзённасць яго выступленняў добра сведчаць ужо назвы гэтых матэрыялаў: «Адбудова Беларусі» («Звон», 1919, 19 кастр.), «Зямельная спекуляцыя» («Беларусь», 1919, 24 кастр.), «Беларускае войска» («Беларусь», 1919, 26 кастр.), «Моладзь ідзе» («Беларусь», 1919, 15 лістап.), «Незалежная дзяржава і яе народы» («Беларусь», 1919, 29 лістап.) і інш.

Купалаўскі адраджэнскі ідэал шматгранны і гарманічны. Публіцыстыка перыяду грамадзянскай вайны перадае многія яго канкрэтныя рысы. У артыкуле «Незалежнасць», апублікаваным у газеце «Беларусь» за 28 лістапада 1919 г., Купала піша, што апошнім часам узнікаюць і атрымліваюць прызнанне ўсё новыя дзяржавы – Польшча, Літва, Украіна, Латвія і інш., якія, зразумела, маюць поўнае права на незалежнасць. Гэткае ж права мае і Беларусь, але рэалізаваць яго не ўдаецца, перашкаджаюць абставіны і непрыхільнікі беларускай незалежнасці.

У 1922 г. з'явіўся на свет зборнік Я. Купалы «Спадчына», які складаўся з твораў, напісаных у гады Першай сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Сутнасць клопатаў, якімі жыў у гэты час паэт, праблемна падкрэслена ў самой назве зборніка – «Спадчына». Купала не мог заставацца раўнадушным да лёсу роднага краю – разам з народам ён шукаў адказаў на карэнныя пытанні часу, жыў і пакутаваў разам з ім. Зборнік адкрываўся вершам «Спадчына», напісаным 19 верасня 1918 г. У ім на ўсю сілу гучыць патрыятычнае пачуццё паэта, якое складае галоўную ідэю кнігі:

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Аб ёй мне баюць казкі-сны,
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены…[5, с. 43].

Кніга «Спадчына» з незвычайнай лірычнай усхваляванасцю і паўнатой адлюстравала карціну нацыянальнага становішча беларускага народа ў пераломна-кульмінацыйны момант яго гісторыі.

Яшчэ раз давялося Я. Купалу выступіць як драматургу: 31 жніўня 1922 г. у Акопах была завершана трагікамедыя «Тутэйшыя», падзеі якой разгортваюцца ў Мінску ў складаны, драматычны час – 1918–1919 гг. Першая дзея ў «Тутэйшых» адбываецца ў лютым 1918 г., калі Мінск акупавалі немцы; другая – у снежні гэтага ж года (адступленне кайзераўскіх войск і прыход Чырвонай Арміі); трэцяя – у ліпені 1919 г. (захоп Мінска легіянерамі Пілсудскага); чацвёртая – у ліпені 1920 г. (вяртанне савецкай улады). Драматург выводзіць на тэатральную сцэну гарадскі тыпаж таго часу: былога калежскага рэгістратара Мікіту Зносака, прайдзісвета Генрыха Мотавіча,

Даму, Папа, Спраўніка, дзяўчыну невядомых заняткаў Насту Пабягунскую. Гэта героі-маскі, кожная з якіх увасабляе пэўны бок тагачаснага жыцця. У вобразе Мікіты Зносака аўтар высмейвае людзей, што здрадзілі народу, яго духоўным каштоўнасцям, адарваліся ад нацыянальнай глебы, гатовы прыстасавацца да любога рэжыму ўлады. У залежнасці ад гэтага ён называе сябе то на рускі манер Нікіціем Знасілавічам, то на польскі – Нікіціўшам Знасілоўскім. Яго жыццёвая філасофія простая да прымітывізму: «А ў мяне... душа рэальная, – гаворыць Мікіта Зносак, – хто мне больш плаціць, таму і служу і чхаць хацеў на ўсякія ідэі». У думках і паводзінах гэтага чалавека адлюстраваліся камічны і трагічны пачаткі, уласцівыя падобнаму тыпу людзей. У яго камізме і трагічнасці праглядваецца старое, заснаванае на сацыяльным і духоўным уціску і эгаізме грамадства, якое нясе сваю долю адказнасці і віны за з'яўленне такога чалавечага феномена – хама і нягодніка.

Захавальнікам нацыянальнай самабытнасці і духоўных асноў асобы выступае ў п'есе Янка Здольнік, ідэалам якога з'яўляецца працоўная, дэмакратычная Беларусь, без цара, паноў і чыноўнікаў. Трагікамедыя «Тутэйшыя» была пастаўлена ў БДТ-1, але спектакль праіснаваў нядоўга. Афіцыйная крытыка адразу ж абвінаваціла аўтара «Тутэйшых» у значных ідэйных недахопах. В. Кнорын – тагачасны сакратар ЦК КПБ – у артыкуле, у якім ішла гаворка пра п'есу «Тутэйшыя», характарызаваў творчасць Я. Купалы і яго паслядоўнікаў як «дробнабуржуазнае народніцтва», далёкае ад пралетарскіх мэтаў класавай барацьбы [2, с. 3]. Вядома, гэта было не так. Я. Купала востра адчуваў змены ў жыцці грамадства і вітаў усё станоўчае, перспектыўнае, што ў ім адбывалася. Сведчанне таму – цудоўны верш «Арлянятам», створаны ў 1923 г. Гэта быў паэтычны зварот да моладзі, наказ свята захоўваць гераічныя традыцыі мінуўшчыны, заклік будаваць новую Бацькаўшчыну:

Вам на памяць Серп і Молат
Даравала доля,
Каб з вас кожны быў, як волат,
Не гнуў плеч ніколі [5, с. 120].

У 1924 г. Купала надрукаваў свой новы твор – паэму «Безназоўнае». Лірычныя абсягі паэмы надзвычай шырокія. Паэт перадае драматызм падзей перыяду грамадзянскай вайны ў Беларусі, адчуванне разбуранасці роднай зямлі, малюе цяжкасці аднаўленчага перыяду, выказвае пазітыўныя спадзяванні на будучыню. Беларусь паўстае тут у сімвалічным вобразе святочна апранутай нявесты:

На галоўцы вянок
З сініх васілёчкаў,
А чырвон паясок
Стан абвіў дзявочы [4, с. 124].

Паэма ўражвае сваім шматгалоссем, багаццем сцвярджэння жыцця, скіраванасцю ў будучыню. Аўтар інтэнсіўна шукае і знаходзіць сродкі, разлічаныя на самы шырокі маштаб абагульнення, не адмаўляючыся пры гэтым ад традыцыйнай народна-песеннай вобразнасці, ад алегорый і сімвалаў (як, напрыклад, той жа «чырвоны паясок» на вясельным убранні нявесты), якія прыдавалі паэме выразнае рамантычнае асвятленне. Як і раней, ён карыстаецца свежым, яркім, каларытным народным словам, якое гучала на вуліцах і плошчах.

Я. Купала, здавалася, быў блізкі да таго, каб канчаткова паверыць, што на Беларусі нарэшце ўсталюецца «права і закон», што народ зажыве нармальным стваральным жыццём, але ў многім старыя звычкі заставаліся, і паэт не мог гэтага не бачыць. 5 чэрвеня 1926 г. напісаны забаронены пазней верш «Акоў паломаных жандар…», які меў тлумачэнне: «На палеміку ў "Сав. Беларусі" аб беларускай мове». Справа заключалася ў тым, што перад гэтым газета «Савецкая Беларусь» надрукавала ананімны ліст з Полацка пад назвай «Вражда из-за языка», у якім у зневажальных, абразлівых выразах гаварылася пра беларускую мову, літаратуру і саміх беларускіх пісьменнікаў. Купала, спрактыкаваны яшчэ на дакастрычніцкім вопыце, распазнае ў ананіме звычайнага шавініста-русіфікатара:

Не па нутру, як смерць, яму,
Што беларускае дзіцё
Бяжыць у сцюжную зіму
У школку пазнаваць жыццё [5, с. 134].

7 лістапада 1927 г. газеты друкуюць паэму Я. Купалы «З угодкавых настрояў», прысвечаную дзесяцігоддзю Кастрычніцкай рэвалюцыі. Фактычнае, рэальнае быццё падмяняецца тут ідэалізаваным адлюстраваннем, фантазіяй, і паэт свядома ідзе на гэта. Ён з вымушаным пафасам услаўляе гістарычныя падзеі рэвалюцыі і новую сацыялістычную рэчаіснасць, аднак некаторыя мясціны гучаць дзіўнавата. Так, напрыклад, паэма заканчваецца радкамі, не пазбаўленымі іранічнай двухсэнсоўнасці:

На дзесятыя угодкі
Варма вараць мёд салодкі,
        А па мёдзе – рукі ў бок
        Ды у скокі крок у крок!

Скача горад, скача вёска,
Адно іскры з-пад падноскаў...
Скачы, ўнуча, скачы, дзед,
Ад пабедаў да пабед! [4, с. 133].

У апошніх радках аўтар зніжае семантычны план, звяртаецца да парадыравання рэчаіснасці. У выніку – прысмак едкай насмешкі і нейкай нават абсурднасці таго, што адбываецца.

У чэрвені 1934 г. Я. Купала прымае ўдзел у рабоце Першага Усебеларускага з’езда пісьменнікаў, а ў жніўні-верасні ўдзельнічае ў рабоце Першага ўсесаюзнага з’езда савецкіх пісьменнікаў, абіраецца – на зайздрасць белаппаўцам – нават у прэзідыум пісьменніцкага форуму. Сустракаецца з М. Горкім, А. Фадзеевым, А. Талстым, С. Стальскім і інш.

Пасля стварэння адзінага саюза савецкіх пісьменнікаў спектр творчай свабоды мастака яшчэ болей звузіўся. Жорсткія рамкі сацыялістычнага рэалізму строга рэгламентавалі літаратурны працэс і мастацкія пошукі пісьменніка. Купалу практычна ўжо не хапала сіл, каб пазбавіцца ад уласцівай 1930-м гг. сістэмы ідэалагічных каардынат. Тым не менш ён заставаўся выдатным нацыянальным паэтам. Сведчанне таму – лепшыя вершы, якім нельга адмовіць у высакароднасці і патрыятызме, прыярытэце агульначалавечага над вузкакласавым, у высокім мастацкім майстэрстве. Праўда, такіх твораў няшмат. У першую чаргу прыгадваюцца, напрыклад, паэма «Тарасова доля», верш «Генацвале» і некаторыя іншыя. Гэтымі творамі паэт, здавалася б, аддаваў даніну часу – тэма дружбы народаў была ў 1930-я гг. афіцыйнай, праграмнай, санкцыянаванай зверху. Аднак Купала здолеў пераадолець яе казённы статус, асэнсаваць вельмі асабіста, узняць на вышыню сэрца.

Што датычыць драматычных, балявых момантаў народнага жыцця, шматлікіх грамадска-сацыяльных праблем і супярэчнасцей, дык Купала, па вядомых прычынах, не мог іх закрануць. Ён з’яўляўся іх відавочцам, сведкам, але вымушаны быў маўчаць. Апрача таго, улады, трэба думаць, у многім здолелі павесіць перад вачыма паэта такую «пamроку», якая засціла ад яго рэальную праўду жыцця.

Да нядаўняга часу вяршыняй лірыкі Купалы 1930-х гг. лічыўся вядомы «ляўкоўскі цыкл», напісаны на дачы ў вёсцы Ляўкі Аршанскага раёна, дзе паэт любіў праводзіць свой летні адпачынак. Гэта вершы «Здаецца ж, было гэта ўчора...», «Сонцу», «Алеся», «Хлопчык і лётчык», «Лён», «Вечарынка», «Сыны», «Старыя акопы», «Госці», «Дарогі», «Сосны» і інш., створаныя ў чэрвені-жніўні 1935 г. У беларускай паэзіі 1930-х гг. яны для многіх прагучалі вельмі нечакана. Раўніцелі артадаксальнага напрамку развіцця савецкай літаратуры (г. зн. сацыялістычнага рэалізму) гатовы былі крытыкаваць Купалу за адыход ад магістральных тэм будаўніцтва сацыялізму, класавай барацьбы ў сферу штодзённага існавання чалавека, яго побыт, нават «інтым».

Так, ляўкоўскія вершы звернуты пераважна да ідэальнага боку жыцця. Аўтар, мяркуючы па ўсім, свядома ішоў да гэтага, мудра адчуваючы прызванне мастака бараніць жыццё, яго адвечны стваральны пачатак, уносіць у навакольную рэчаіснасць гармонію і згоду. Савецкая дзяржава разглядала чалавека ўсяго толькі як суб’ект класавай барацьбы, як будаўнічы матэрыял для светлай будучыні, а ў «ляўкоўскім цыкле» ён раптам трапіў у цэнтр паэтычнай канцэпцыі жыццядзейнасці. Творы, што ўваходзяць у «ляўкоўскі цыкл», далёка не раўназначныя. Скажам, верш «Алеся» хвалюе чытача да гэтага часу. У ім Купала распавядае пра новую долю моладзі. Звычайна лёс беларускай дзяўчыны складваўся наступным чынам:

Будзеш кужаль ты прасці,
Будзеш ткаці кросны,
Выглядаці долі, шчасця
Ў маладыя вёсны [6, с. 65].

У «Алесі» таксама, як і ў вершы «А зязюлька кукавала...» (1921) уводзіцца матыў кукавання зязюлі, але на гэты раз старажытная вяшчуння прадказвае гераіні шчаслівы лёс. Пакаленне Алесі – іншыя, на думку паэта, людзі. Яму і сапраўды здавалася, што споўнілася, нарэшце, яго даўняя мара (успомнім хаця б зборнік «Гусляр») аб абнаўленні і разняволенні чалавека:

Як набралася моцы
Матчына дачушка,
Паляцела да сонца
Пералётнай птушкай.

Паляцела дзяўчына
Самалётам гонкім
Над шчаслівай краінай,
Над роднай старонкай [6, с. 66].

Як паэт Купала валодаў дарам узняць простую з'яву да завоблачных вышынь, і ў вершы «Алеся» гэтае ўменне праявіла сябе ў поўнай меры. Купалаўская «Алеся» – гэта ўслаўленне неадольнай сілы жыцця, перамога агульначалавечага ў свядомасці паэта і ў яго творчасці. Да яе тэматычна прымыкае верш «Хлопчык і лётчык», герой якога таксама захоплены марай адкрыць для сябе шырокі свет з усімі яго таямніцамі. Гэта жаданне блізкае і зразумелае паэту, якому падабаецца цікаўнасць хлопчыка, яго прага да ведаў, здольнасць несці ў свет дабро.

Разам з развіццём мастацкай індывідуальнасці Янкі Купалы ішоў працэс уплыву яго асобы і творчасці на беларускую літаратуру, асабліва паэзію. Менавіта пад дабратворным уздзеяннем Я. Купалы звярнуліся да мастацкага слова, прыйшлі ў прыгожае пісьменства К. Крапіва, П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў, П. Панчанка, многія іншыя айчынныя паэты.

Асобная старонка нацыянальнай літаратурнай гісторыі – уплыў творчага генія Купалы на ідэйна-мастацкія пошукі заходнебеларускай паэзіі. «У цяжкай шматгадовай барацьбе Заходняй Беларусі за сваё вызваленне, – аўтарытэтна падкрэсліваў у артыкуле "Янка Купала і Заходняя Беларусь" непасрэдны ўдзельнік і знаўца тых грамадска-сацыяльных працэсаў паэт В. Таўлай, – выключную ролю адыграла творчасць Янкі Купалы.

…Дэмакратычныя ідэі і рэвалюцыйныя лозунгі дакастрычніцкай творчасці Купалы асталіся ў Заходняй Беларусі і надалей надзённымі, праграмнымі, здольнымі ўзнімаць народ на барацьбу за вызваленне ад нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту.

У гэтых творах заходні беларус пазнаваў свае настроі, вобразы свайго паднявольнага жыцця, долю свайго «забранага краю». Нават такія, здавалася б, даўно прагучаўшыя намаганні, як лозунг «людзьмі звацца», не страцілі мабілізуючага значэння і ўзмацнялі пачуццё чалавечай годнасці селяніна-беларуса, да якога польскія памешчыкі і чыноўнікі па старашляхецкай традыцыі ставіліся, як да «хама».

Таму ў асноўным уся дарэвалюцыйная творчасць Купалы, даходзячы да заходнебеларускага чытача, раскрывалася ва ўсёй сваёй патэнцыяльнай сіле і ўздзейнічала на свядомасць самым непасрэдным чынам» [11, с. 196].

У сілавым полі ідэйна-эстэтычнага вопыту і традыцый Я. Купалы развівалася творчасць Г. Леўчыка. У дарэвалюцыйныя гады ён быў, мабыць, адным з самых тыпалагічна набліжаных да народнага песняра беларускіх аўтараў. І гэта не выпадкова. Г. Леўчыку імпанавалі чалавечыя якасці і жыццёвыя прынцыпы Я. Купалы, духоўна-светапоглядныя і мастацка-стылявыя асаблівасці яго творчасці, пазіцыя ахвярнага грамадзянска-патрыятычнага заступніцтва, якую ён абраў, і інш.

У прысвечаным свайму творчаму пабраціму і настаўніку санеце «На Купалле» (1907) Г. Леўчык засведчыў далучанасць да адвечных пластоў народнай свядомасці і маралі, інтарэсаў і мэтаімкненняў сацыяльных нізоў грамадства. Як і ў многіх творах Я. Купалы, у гэтым вершы лірычны герой паўстае ў вобразе нястомнага падарожніка, што зморана крочыць ад адной сялібы селяніна-аратая да другой, мудрага праўдашукальніка, устурбаванага праблемамі і бедамі роднага краю.

Чытаючы некаторыя вершы паэта, напрыклад, такія, як «О, сэрца, ты не плач!», «Хто адрокся сваіх…», «Ёй», «Дружна, брацця!..», «Мы жывём надзеяй...», «Усё пераходзе, у далі знікае» і інш., міжволі звяртаеш увагу на іх тыпалагічныя паралелі і сыходжанні, зместава-вобразнае і паэтыка-стылявое перакліканне з многімі творамі Я. Купалы. Скажам, выразнае ідэйна-эстэтычнае падабенства назіраецца паміж вершамі «Хто адрокся сваіх…» Г. Леўчыка і «Песенька для некаторых маладых людзей» Я. Купалы. У Я. Купалы верш выбудоўваецца ў форме філасофска-аналітычнай развагі, раскутага маналога – з канкрэтнымі адраснымі пасыламі і пералічэннямі. Паэт скрушліва канстатуе, што, займеўшы добрыя пасады, выгадна ўладкаваўшыся ў жыцці, некаторыя «маладыя людзі дужа вучоныя» адмаўляюцца ад сваіх ранейшых ідэй і прынцыпаў, становяцца на шлях здрадлівага адступніцтва ад маральнага абавязку служыць інтарэсам абяздоленых і пакрыўджаных беларусаў. Дактары, «брахунцы-адвакаты», інжынеры, судовыя службоўцы, банкіры і інш. забываюць пра сваё паходжанне, з іх «кожны сыт будзе, багацце чужою То крыўдай, то працай размножа» [3, с. 80]. Асноўнымі носьбітамі асуджэння двурушніцкай абыякавасці і ашуканскага крывадушша «пярэваратняй» маралі маладых «паночкаў» у Я. Купалы выступаюць іронія і сарказм:

Так будзе з вас кожны слядамі йсці дзедаў,
Не знаючы гора ніколькі,
І ўсе вы, і ўсе вы палкі дармаедаў
Сабой павялічыце – й толькі [3, с. 80].

Тое, што ў Я. Купалы фігуруе ў знешне стрыманай, амаль лагоднай форме, у Г. Леўчыка набывае даволі скандэнсаваны выгляд, форму выраку-кленічу, выяўляецца хлёстка і безапеляцыйна, з характэрным народным дасціпам і красамоўствам. Ідэйна-зместавая сабранасць твора дапаўняецца эмацыянальна-пачуццёвай запалістасцю і палемічнасцю. Верш звяртае на сябе ўвагу значнай духоўна-маральнай устурбаванасцю аўтара, грамадзянска-патрыятычным пафасам, экспрэсіўнасцю моўных сродкаў:

Хто адрокся сваіх,
Хто стыдацца нас стаў
І прыліп да чужых, –
Каб ён свету не знаў!

Мову родную хто
Пазабыў, асмяяў,
Загубіў за нішто, –
Каб ён свету не знаў! [7, с. 29].

Заходнебеларускі перыяд у творчай працы Г. Леўчыка з’явіўся перыядам далейшага працягу і развіцця духоўна-мастацкіх традыцый Я. Купалы. Рэагуючы на складаныя жыццёвыя рэаліі, разгортванне ў краі народна-вызваленчага руху, яго паэзія ўзбагачалася новымі фарбамі і адценнямі. Яна набіралася пэўнай грамадзянска-патрыятычнай актыўнасці, была прасякнута драматызмам мыслення і перажывання, пафасам адмаўлення. Такія вершы Г. Леўчыка, як «Не нам, беларусам, не нам...», «Я багат, багаты», «Душыцелям слова», «Школьны званок» і інш., нясуць на сабе выразны адбітак Купалавага ўплыву, пераклікаюцца з яго творамі. Як і Я. Купала, Г. Леўчык паэтызаваў высокі грамадзянска-пачуццёвы стан асобы, працу па матэрыялізацыі беларускага народнага духу, рэалізацыі нацыянальнай ідэі. Імкнучыся падхапіць заступніцкую купалаўскую місію, ён бараніў стыхію роднамоўя ад засілля прышлых «ворагаў Беларушчыны», пагардлівай абыякавасці шматлікіх дамарошчаных махляроў і адшчапенцаў.

Ёсць падставы меркаваць, што ў многім знаёмствам з вершам Я. Купалы «Песні вайны» быў навеяны верш Г. Леўчыка «Дажынкі на Беларусі ў 1920 г.». Аб тым, што адзін мастацка-творчы акт стаў рэальна магчымы пасля другога, сведчыць і тая акалічнасць, што пачатковыя радкі абедзвюх строф Леўчыкавага верша ўяўляюць сабой трансфармаваны варыянт аднаго з Купалаўскіх – «І вось жніва, што за жніва!»

Перад намі тыповыя сімвалізаваныя карціны ахвярнага ваярскага пабоішча, якое ў сістэме індывідуальна-аўтарскага мастацкага мыслення па даўняй фальклорна-дэманалагічнай традыцыі выклікае тыпалагічныя асацыяцыі падабенства са жнівом – адвечна-жыццядайным земляробчым

заняткам чалавека. Вершы звяртаюць на сябе ўвагу адметным асэнсаваннем непапраўна-жахлівай трагедыі людскіх лёсаў, сцвярджэннем спаконных духоўна-гуманістычных пачаткаў жыцця. Слоўна-сэнсавыя адзінкі паэтаў – кусцістыя, крамяныя, вобразна-метафарычныя малюнкі – прадметна-рэчыўныя, фактурныя, эмацыянальна-настраёвыя штрыхі і фарбы – тужлівыя, жалобныя. Разам з тым, у адрозненне ад Купалаўскага твора, у якім акцэнтуецца, галоўным чынам, першы складовы элемент асацыятыўнай тыпалогіі, тое, што супастаўляецца, у вершы Г.Леўчыка, дзе карціна ў значна большай ступені фальклорна-сімвалізаваная, першы план аддадзены таму, з чым бітва супастаўляецца, выніку супастаўляльнага параўнання:

...Вось так жнеі, вось так жніва!
«Збожжа» шэра, чорна, сіва...
Гэта ж людзі ў кроўнай лужы, –
Серп пажаў іх гостры, дужы.
Не ў гумне ім – ў гробе быці,
Чэрві будуць малаціці...
Іх зярнят люд не пазнае,
Ўсе «снапы» пясок зраўняе [7, с. 47].

Вершы Г. Леўчыка «Да Беларусі» і «Маё ўваскрэсенне» тыпалагічна блізкія Купалаўскім творам – адпаведна вершу «Я не сокал», паэме «Курган» і вершу «Песня званара».

Ідэйна-эстэтычныя традыцыі Я. Купалы з’явіліся той спрыяльнай глебай, на якой актыўна прадукавалі мастацкія таленты С. Станкевіча, У. Жылкі, П. Пестрака, М. Васілька, М. Машары, Л. Геніюш і многіх іншых заходнебеларускіх паэтаў.

Падзвіжніцкая творчая дзейнасць Я. Купалы вялікі уплыў зрабіла на фарміраванне асобы, станаўленне мастацкай індывідуальнасці, выпрацоўку асноў літаратурнага майстэрства найлепшага паэта Заходняй Беларусі – Максіма Танка.

М. Танк з ранніх гадоў добра ведаў і любіў творчасць Я. Купалы, Я. Коласа і М. Багдановіча, лічыў сябе спадкаемцам традыцый выдатных нацыянальных майстроў слова, аб чым сведчаць многія яго дзённікавыя нататкі, а таксама прысвечаныя паэтам мастацкія творы. «У годы свайго станаўлення як паэта, – напамінаў ён у лісце да аднаго з аўтараў артыкула, М. Мікуліча, – арыенцірамі ў маіх пошуках нацыянальнай самасвядомасці, сацыяльнай справядлівасці перадусім была творчасць Я. Купалы і Я. Коласа». У вершах «Янку Купалу», «28 чэрвеня» і іншых паэт адзначае, што «ў дні мінулае нядолі» Купалавымі «песнямі народ Рваў межы, кайданы няволі і прывітаў зары усход», прызнаецца, што на старонках яго «несмяротных кніг» здаўна шукаў і знаходзіў адказы «на ўсе пытанні»: «З крыніц тваіх жывучых песень Мы ўсе пілі гаючы сок. Твой творчы шлях у даль прамянее, Не зарасці яму трысцём…» [12, с. 82, 84].

Малады М. Танк даволі актыўна і плённа развіваў шмат якія характэрныя асаблівасці ідэйна-мастацкага свету Я. Купалы. Так, у шэрагу твораў Я. Купалы дарэвалюцыйнага перыяду, паварочваючыся рознымі гранямі, раскрываецца культурна-асветніцкая праблематыка. Паэт працягваў адпаведную традыцыю нацыянальнай літаратуры, запачаткаваную яшчэ Ф. Скарынам і прадоўжаную пісьменнікамі XIX стагоддзя. Праграмны верш «Вучыся…», напрыклад, актуалізуе думку аб дужа важнай ролі вучобы, сістэмы грунтоўных ведаў, адукацыі на канкрэтным этапе жыццядзейнасці нацыі, у перспектыўным вырашэнні многіх адвечных праблем сацыяльных нізоў. Яны садзейнічаюць росту самасвядомасці беларусаў, станаўленню і развіццю іх духоўна-сацыяльнага ідэалу, пасабляюць «Змагацца з нядоляй, з няволяй»:

Вучыся, нябожа, вучэнне паможа
Змагацца з нядоляй, з няволяй…
Што мучыць сягоння, што думкі трывожа, –
Збяжыць і не прыйдзе ніколі.
………………………………………………

Крыўдзіцеляў зможаш, след вечны праложыш
І к долі, і к волі, і к славе…
Адно ты прачніся, вучыся, як можаш,
Ці дома, ці на школьнай лаве [3, с. 144, 145].

«Верш “Вучыся, нябожа”, – падкрэсліваў В. Таўлай у артыкуле “Творчасць Янкі Купалы ў барацьбе за ўз’яднанне беларускага народа”, – разбудзіў цягу да асветы многіх тысяч людзей. Ён здаваўся як бы адмыслова напісаным для Заходняй Беларусі» [11, с. 215].

Выкарыстоўваючы мастацкі вопыт Я. Купалы, распрацоўваючы гэты аспект ідэйнай праблематыкі яго творчасці, напрыклад, у вершы «Школьнік», давераснёўскі М. Танк укладвае ў яго новы, актуальны для заходнебеларускай рэчаіснасці змест, напаўняе матывамі змагання беларусаў за ўз’яднанне ў адзінай дзяржаве (далёка не выпадковы тут факт згадвання зборніка вершаў выдатнага паэта):

Ідзеш ты, мой браце, нялёгкай дарогай
Навуку мазольна сабе здабываць.
Сячэ дождж асенні, стаміліся ногі,
Навокал – нікога нідзе не відаць.

Лазовыя лапці, аборы апалі,
Кашуля-дзяруга, сярмяжына – з лат,
За пазухай – луста з «Жалейкай» Купалы…
Ну што ж ты задумаўся, брат?

Знай: хутка ты ўбачыш свой край у світанні,
У ззянні чырвоным усходніх зарніц…
Ты мусіш змагацца, а ў гэтым змаганні
І песні, і сонца, і волю здабыць! [10, с. 62].

Значнае месца ў творчасці Я. Купалы ранняга перыяду належыць тэме і вобразу працы. Праз многія вершы паэта, напрыклад, такія, як «На старую ноту», «З песень беларускага мужыка» і інш., скразной ніткай праходзіць думка аб тым, што праца заключае ў сабе вялікія патэнцыяльныя магчымасці, выкарыстанне якіх можа вывесці на значныя вынікі, тоіць у сабе перспектывы грамадска-сацыяльных зрухаў і пераўтварэнняў. Пры гэтым, па ўсім відаць, асноўную стаўку паэт рабіў на асаблівасці сімвалізацыі вобраза працы, прыём мастацкай умоўнасці і абстрагаванасці. Ва ўсякім выпадку якраз такое адчуванне застаецца пасля прачытання вершаў «Касьба», «Чаго нам трэба» і некаторых іншых:

Дружна йдзі, бедны люд, калі сонца к касьбе
Кліча з неба ды голадам мучышся ты;
Рэж траву, дабывай долю сілай сабе,
З часам выйдзеш і ты з беднаты, з цемнаты [3, с. 225].

М. Танк, непасрэдны ўдзельнік і пясняр змагарскага руху народа Заходняй Беларусі, развіваючы і паглыбляючы купалаўскі вобраз працы, шмат у чым відазмяняе яго. У вершах «Палавічнік», «Жнівам», «Жаць ідзе батрачка рана…» і іншых паэт, з аднаго боку, канкрэтызуе і завастрае яго, надзяляе рэальна-гістарычнымі рысамі, а з другога – вобраз працы, як правіла, вырастае і развіваецца ў яго творах на глебе павышанай экспрэсіўнасці перажыванняў лірычнага героя, падкрэслена-канцэнтраванага выяўлення жыццёвых працэсаў і супярэчнасцей, узбуйняецца сэнсава і эмацыянальна. Ён выводзіцца на шырокія абсягі філасофска-канцэптуальнай важкасці і шматмернасці, пратвараецца ў адну з самых значных і характарыстычных духоўна-эстэтычных катэгорый:

Плуг у руках,
З ім чарадзей я на чорных барознах
У шэрай сярмязе і ў лапцях лазовых…
Чорныя
скібы
кругом.

Дыхаюць грудзі
Шырай і шырай…
Сінім прасторам і даллю.
Што ж не ляціш ты, жалезны мой вырай,
Не адклікаешся сталю?
Чорныя
скібы
кругом.

Звоніць аб камень
Сталёвы нарог.
Конь упіраецца, скібы цяжкія… [10, с. 39].

Своеадметнасцю праблемна-тэматычнага плана, у пэўнай ступені асацыятыўнай вобразнасцю верш М. Танка «Чорныя скібы» пераклікаецца з вядомым купалаўскім «Араты»:

Цягнецца араты
За сахой крывой.
Конік слепаваты
Трасе галавой.

Бразджыць, скача сошка
То на пень, то з пня…
Цяжанькая ношка,
Араты, твая! [3, с. 32].

Думаецца, шмат у чым арыентуючыся на рамантычна-ўзвышаныя, напружана-дынамічныя творы Я. Купалы, М. Танк схіляўся ў сваёй заходнебеларускай лірыцы да ідэйна-зместавай значнасці і ёмістасці, падкрэсленай канцэнтраванасці вобразна-метафарычнага насычэння радка. Часта ў нязмушанасці прамаўлення, знешняй вяласці і «расхрыстанасці», сінтаксічнай раскутасці паэтавага слова была заключана гранічная ўнутраная сабранасць і сканцэнтраванасць, прытоены залежы вялікай энергіі і волі, пачаткі сапраўднага літаратурнага мастацтва. На першы погляд перад намі досыць хаатычна накіданыя штрыхі, а ў іх, між іншым, – цэласная карціна заходнебеларускай рэчаіснасці, гісторыя чалавечага лёсу:

Аловак адабралі –
Пішу скупым промнем сонца,
што прабіўся праз краты;
Паперы няма –
Пішу на стаптаным паліцэйскімі ботамі,
Акрываўленым лісце сваёй памяці;
Маркі няма –
Наклейваю на грыпс
Надзею сваю… [10, с. 66].

Здаецца, якраз да гэтых праграмных радкоў М. Танка адносіцца вядомае заключэнне крытыка М. Гея пра тое, што мастацкі твор ёсць «высокаарганізаваная слоўная сістэма, слоўны арганізм, складаная сузалежнасць і спалучэнне структур, такое ўтварэнне, у якім кожная клетачка – элемент цэлага. Яна абавязкова змястоўная сама па сабе (“в себе”) і, вылучаючы свой гэты змест, яна атрымлівае “назад” новы змест ад гэтага цэлага» [1, с. 166]. З усімі на тое падставамі дадзены верш трэба разглядаць як матэрыялізацыю адной з самых ёмістых і вычарпальных формул тагачасных ідэйна-мастацкіх шуканняў маладога паэта. Менавіта праз аспекты такой ці блізкай да яе «высокаарганізаванай слоўнай сістэмы», асноўнымі з якіх з’яўляюцца сэнсавая важкасць і канцэнтраванасць, асацыятыўна-метафарычная парадаксальнасць і шматмернасць, маштабнасць і адначасова прадметная рэчыўнасць малюнка, урэшце, фармальная, паэтыка-стылявая раскутасць, праходзіла далейшае паглыбленне індывідуальна-аўтарскага пачатку лірыкі М. Танка.

Я. Купала шчыра вітаў звестку аб уз’яднанні Заходняй Беларусі ў адзінай БССР. Паэт у складзе пісьменніцкай брыгады наведаў Брэстчыну, Гродзеншчыну, Беласточчыну, Віленшчыну... У тым жа 1939 г. ён апублікаваў цыкл вершаў «На заходнебеларускія матывы»:

Ты з Заходняй, я з Усходняй
Нашай Беларусі,
Больш з табою ўжо ніколі
Я не разлучуся [6, с. 157].

Гэтыя радкі паэт чытаў на пасяджэнні Народнага сходу Заходняй Беларусі, які адбыўся 26 кастрычніка 1939 г. у Беластоку. Тады ж, у кастрычніку, ён разам з Я. Коласам піша і друкуе зварот да пісьменнікаў Заходняй Беларусі.

Вялікая Айчынная вайна заспела Купалу ў Каўнасе, дзе ён знаходзіўся па запрашэнні літоўскіх пісьменнікаў. Адтуль паэт спешным парадкам вяртаецца ў Мінск, але нямецкія бомбы сыпаліся ўжо і на сталіцу Беларусі. Я. Купала выязджае на дачу ў Ляўкі, а адтуль, калі фронт пачаў набліжацца, – у Маскву. На старонках «Правды», «Известий», «Красной звезды» і іншых газет паэт выступае з вершамі і ўсхваляванымі публіцыстычнымі артыкуламі. Хто не памятае магутнай духаўздымнай сілы вершаў «Беларускім партызанам», «Зноў будзем шчасце мець і волю» і інш.:

Партызаны, партызаны,
Беларускія сыны!
За няволю, за кайданы
Рэжце гітлерцаў паганых,
Каб не ўскрэслі век яны [6, с. 172].

Верш «Беларускім партызанам» размнажаўся ў падпольных партызанскіх друкарнях, распаўсюджваўся на захопленай ворагам тэрыторыі Беларусі. Паводле сваёй паэтыкі ён нагадвае лепшыя ўзоры паэзіі Я. Купалы дарэвалюцыйнай пары – высакародныя, гуманістычна-наступальныя вершы «Зашумеў лес разгуканы», «Пойдзем...», «Родныя песні», «Ворагам Беларушчыны» і інш. з уласцівым для іх лірыка-публіцыстычным пафасам. У вершах Я. Купалы 1941–1942 гг. нібы абудзілася яго маладая творчая сіла, здольнасць увабраць у сваім лірычным «я» агульную, усенародную эмоцыю і волю і выявіць гэта так, каб пачулі і ўспрынялі ўсе.

Восенню 1941 г. пачалася эвакуацыя і з Масквы. Купала пераязджае ў гарадскі пасёлак Печышча Татарскай АССР, які знаходзіўся за 14 кіламетраў ад Казані. Нягледзячы на кепскі стан здароўя, паэт не спыняе актыўнай грамадскай і літаратурнай дзейнасці. У Печышчах ён напісаў вершы «Хлопчык і лётчык на вайне», «Грабежнік», «Дзесяць асінавых колляў», «Зноў будзем шчасце мець і волю», «Паўстаў народ». У гэтых вершах-закліках Купала з гневам і нянавісцю выкрывае нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ён горача верыў у перамогу свайго народа і змагаўся за яе.

Не стала Янкі Купалы 28 чэрвеня 1942 г. Апошні акт жыццёвай драмы вялікага беларускага нацыянальнага паэта да нашага часу пакрыты таямніцай. Ёсць, здаецца, небяздоказныя меркаванні, што Купала памёр не сваёй смерцю, што яго ўсё ж такі наздагнала няўмольная сталінская «ласка».

Пахавалі Янку Купалу 1 ліпеня 1942 г. у Маскве на Ваганькаўскіх могілках. Праз дваццаць гадоў прах паэта быў перавезены ў Мінск і пахаваны тут, на Вайсковых могілках, побач з магілай Якуба Коласа.

Творчасць Янкі Купалы ад першага і да апошняга верша належыць Беларусі і яе нацыянальнай культуры. Я. Колас слушна заўважыў, што «нельга ўявіць беларускі народ без такой велічнай постаці, як Янка Купала». У Купале, як і ў самім Коласе, а таксама ў Багдановічу, Гарэцкім, Гаруне выявіўся духоўны вынік усіх папярэдніх этапаў сацыяльна-гістарычнага развіцця беларускага народа. Творчасць Купалы дае яскравае ўяўленне пра самыя істотныя, вызначаьныя рысы беларускага нацыянальнага характару – чалавечую годнасць, духоўную моц і сілу, працавітасць, талерантнасць і інш. «У сьвеце літаратуры, – разважаў, адказваючы на пытанні аднаго з аўтараў артыкула, М. Мікуліча, Р. Барадулін, – Янка Купала займае сваё, Богам дадзенае яму мейсца, бо па Янку Купалу ў першую чаргу ведалі, ведаюць і яшчэ доўга будуць ведаць беларускае гожае пісьменства. У сьвеце людства зноў жа Янка Купала займае адметнае мейсца, бо па Янку Купалу ў першую чаргу трэба меркаваць пра Беларусь, пра беларусаў, пра беларушчыну. Беларускі характар у асобе Янкі Купалы атрымаў сваё адухоўленае завяршэньне» [8, с. 202].

З шэрагу сваіх папярэднікаў і паэтаў-сучаснікаў Янку Купалу вылучае магутны пяснярскі тэмперамент, незвычайная сіла лірызму, напал унутранай энергіі, шырыня ахопу з'яў жыцця. Купала адкрыў самыя разнастайныя бакі і праявы чалавечага існавання, творчасць паэта ўвабрала ў сябе прасторы сусвету. Маштаб чалавечай асобы ў яго вызначаецца ў барацьбе з сіламі зла і прыгнёту. Ён рана зразумеў, што ўсякі ўціск над асобай – злачынства, і ўсё жыццё змагаўся з крыўдай, несправядлівасцю і адступленнямі ад глыбінных законаў жыцця.

Рухаючай сілай Купалавай творчасці была любоў да людзей, у чалавечай асобе ён бачыў стымул і самамэту грамадскага развіцця. Арганічнае спалучэнне сацыяльнай праблематыкі і нацыянальнай, агульнанароднай і асабістай, духоўнай зрабіла Я. Купалу буйнейшым прадстаўніком беларускай літаратуры XX стагоддзя.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Гей, Н. К. Искусство слова: о художественности литературы / Н. К. Гей. – М.: Наука, 1967. – 346 с.
2. Звезда. – 1922. – 17 сент. – С. 3.
3. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Вершы, пераклады 1904–1907. – 462 с.
4. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1999. – Т. 6: Паэмы, пераклады. – 430 с.
5. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала.– Мінск: Маст. літ., 1997. – Т. 4: Вершы, пераклады 1915–1929. – 446 с.
6. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1998. – Т. 5: Вершы, пераклады 1930–1942. – 278 с.
7. Леўчык, Г. Доля і хлеб: выбраныя творы / Г. Леўчык. – Мінск: Маст. літ., 1980. – 192 с.
8. Микулич, М. «Мы все – дети Купалы…» / М. Микулич // Нёман. – 2012. – № 7. – С. 201–205.
9. Минский курьер. – 1908. – 23 авг. – С. 3.
10. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / М. Танк. – Мінск: Беларус. навука, 2006. – Т. 1: Вершы (1930–1939). – 374 с.
11. Таўлай, В. Творы / В.Таўлай. – Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1961. – 404 с.
12. Янку Купалу. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1949. – 361 с.

## References

1. Gei N. K., *Iskusstvo slova: o khudozhestvennosti literatury* [The Art of the Word: the Artistry of Literature], Nauka, Moscow, RU, 1967.
2. *Zvezda* [Star], 1922, 17 September, p. 3.
3. Kupala Ia., *Pouny zbor tvorau: u 9 t., T. 1: Vershy, peraklady 1904–1907* [Complete Works: in 9 v., V. 1: Poems, translations, 1904–1907], Mastatskaia Litaratura, Minsk, BY, 1995.
4. Kupala Ia., *Pouny zbor tvorau: u 9 t., T. 6: Vershy, peraklady* [Complete Works: in 9 v., V. 6: Poems, translations], Mastatskaia Litaratura, Minsk, BY, 1999.
5. Kupala Ia., *Pouny zbor tvorau: u 9 t., T. 4: Vershy, peraklady, 1915–1929* [Complete Works: in 9 v., V. 4: Poems, translations, 1915–1929], Mastatskaia Litaratura, Minsk, BY, 1997.
6. Kupala Ia., *Pouny zbor tvorau: u 9 t., T. 5: Vershy, peraklady, 1930–1942* [Complete Works: in 9 v., V. 5: Poems, translations, 1930–1942], Mastatskaia Litaratura, Minsk, BY, 1998.
7. Leўchyk G., *Dolia i khleb: vybranyia tvory* [Fate and Bread: Selected Works], Mastatskaia Litaratura, Minsk, BY, 1980.
8. Mikulich M., "We are All Kupala's Children ...", *Neman* [Neman], 2012, no. 7, pp. 201–205.
9. *Minskii kur'er* [The Minsk Courier], 1908, 23 August, p. 3.
10. Tank M., *Zbor tvorau: u 13 t., T. 1: Vershy (1930–1939)* [Works: in 13 v., V. 1: Poems (1930–1939)], Belaruskaia Navuka, Minsk, BY, 2006.
11. Taulai V., *Tvory* [Compositions], Dziarzhaunae Vydavetstva BSSR, Minsk, BY, 1961.
12. *Ianku Kupalu* [To Yanka Kupala], Publishing House of the Academy of Sciences of BSSR, Minsk, BY, 1949.

## Информация об авторах

***Гниломедов** Владимир Васильевич* – акад., д-р филол. наук., проф., гл. науч. сотрудник. ГНУ «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси» (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: bel-centre@bas-net.by.

***Микулич** Николай Владимирович* – канд. филол. наук, доцент, зав. отделом. ГНУ «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси» (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: mikmik43@gmail.com.

## Information about the authors

***Gnilomedov** Vladimir Vasilyevich*, Academician, D. Sc. (Philol.), Professor, Chief Scientific Researcher, Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: bel-centre@bas-net.by.

***Mikulich** Nikolay Vladimirovich*, Ph. D. (Philol.), Associate Professor, Head of Department, Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E -mail: mikmik43@gmail.com.

## Для цитирования

**Гніламедаў, У. В.** Прарок адраджэння (Да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы) / У. В. Гніламедаў, М. У. Мікуліч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 3. – С. 87–102.

## For citation

**Gnilomedov, V. V.** The Prophet of Renaissance (To the 135th Anniversary of Yanka Kupala's Birth) / Gnilomedov, V. V. and Mikulich, N. V. // Proc. Natl. Acad. Sci. Belarus: Hum. Ser., no. 3, 2017, pp. 87–102.